**Наталля Кузьміч**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (г. Мінск, Беларусь)*

# ТЭМА КУЛЬТУРЫ НА САЙТАХ РЭГІЯНАЛЬНАГА ДРУКУ ГРОДЗЕНСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Як вядома, тэрмін «культура» паходзіць ад лацінскай назвы «cultura», што азначае «апрацоўванне, ураблянне». Культуру прынята падзяляць на матэрыяльную, духоўную і сацыяльную, г. зн. культуру чалавечых адносін. У нашай тэме цікавасць уяўляе духоўная культура як сістэма духоўных каштоўнасцей, створаных у працэсе грамадска-гістарычнай дзейнасці чалавека. Менавіта чалавек з’яўляецца суб’ектам культуры; з аднаго боку – стварае культурныя каштоўнасці, з другога боку – культура прыкметна ўплывае на фарміраванне яго светапогляду, паводзіны і дзеянні.

Тэма культуры заўважна прадстаўлена на старонках многіх сродкаў масавай інфармацыі. Прычым, у буйных газетах дзейнічае спецыялізацыя, дзе праблемамі культуры займаюцца пастаянныя журналісты, значыць, ёсць магчымасць напрацоўваць практычны вопыт, сачыць за ім у іншых выданнях, паслядоўна вывучаць тэматыку і г. д. Такой магчымасці ў рэгіянальным друку няма, аднак тут можна адзначыць добрае веданне масцовага культурнага асяродку, тых работнікаў, якія прафесійна займаюцца пытаннямі культуры ў раёне, самадзейных аматараў і інш.

У рэгіянальным друку Гродзенскай вобласці, як, у прынцыпе, і ў іншых абласных газетах, тэма культуры займае не асноўнае месца, але перыядычна з’яўляюцца матэрыялы розных жанраў: заметкі, інтэрв’ю, карэспандэнцыі, час ад часу рэпартажы аб значных падзеях мясцовага культурнага жыцця, друкуюцца справаздачы. Узнімаюцца актуальныя праблемы мясцовага значэння, ставяцца пытанні культурна-масавай работы, да іх абмеркавання прыцягваецца грамадскасць; не ўпускаецца тэма захавання культурна-гістарычнай спадчыны. На электронных рэсурсах рэгіянальных газет таксама прысутнічае культурная тэматыка ў рознай ступені (асобная рубрыка «Культура», згадванне ў раздзеле «Актуальна», асобныя матэрыялы на тэму культуры ў розных рубрыках і г. д.), што абумоўлена спецыфікай выдання.

На сайце раённай газеты Мастоўскага раёна «Зара над Нёманам» змешчана дастаткова рубрык, сярод якіх асобна пазначана «Культура и история», таксама культурная тэматыка падаецца ў раздзелах «Актуально», «Официально». Звернем увагу на раздзел «Культура», дзе

інфармуецца пра падзеі культурнага жыцця ў раёне. Напрыклад, матэрыял «Лялечны спектакль “Калядная гісторыя”» прадставілі мастаўчанам юныя акцёры» (В. Цішко, 20.01.2019). Матэрыял выглядае прэзентабельна: многа фотаздымкаў, дзе буйным планам падаюцца ўдзельнікі мерапрыемства, сам матэрыял падаецца не проста як справаздача з мерапрыемства або расповед пра спектакль, хутчэй тут можна гаварыць пра рэпартаж з элементамі інтэрв’ю (ёсць ураженні ўдзельнікаў, прысутных, акцёраў і пастаноўшчыкаў), таксама ёсць і меркаванне аўтара матэрыялу. Або, напрыклад, матэрыял «И снова “Везучая” на сцене Мостовского РЦК» (Н. Шеўчык, 22.01.2019) пра пастаноўку народнага тэатра МРЦК, з якога адкрыўся тэатральны сезон. «Адораныя і таленавітыя навучэнцы Мастоўскай дзіцячай школы мастацтваў» (Н. Шэўчык, 24.01.2019) – заметка з элементамі інтэрв’ю пра ўзнагароды, атрыманыя ў новым годзе, за перамогі ў двух міжнародных конкурсах таленавітых вакалістаў і інструменталістаў. Варта дадаць, што аўтаматычна матэрыялы з гэтага раздзела, як і з іншых, адкрываюцца ў рубрыцы «Блоги наших журналистов».

На электронным рэсурсе Смаргонскай раённай газеты «Светлы шлях» тэма культуры прадстаўлена ў рубрыцы «Культура», якая складаецца са «Сморгонщины исторической» і «Фестиваля». Як вядома, Смаргоншчына з’яўляецца радзімай М. К. Агінскага, і ў Залессі праводзяцца разнастайныя міжнародныя мерапрыемствы, прысвечаныя яго творчасці, таму бачыцца заканамерным размяшчанне матэрыялаў пра гэтае мястэчка, напрыклад, «В Залесье открылась выставка литовского художника Романаса Борисоваса «Сквозь призму руин» (В. Войтка, 26.01.2019) або «Прэзентацыя кнігі “БлагоДарю”, Залесье адбылася ў музеі-сядзібе Міхала Клеафаса Агінскага» (В. Войтка, 24.01.2019). Таксама і матэрыял «В Сморгонской средней школе № 5 открылась выставка картин Сергея Пыжикова» (Т. Чарняўскай, 24.01.2019) выглядае як справаздача з мерапрыемства з элементамі інтэрв’ю і ацэнкай жуhналіста. Несумненна, журналісты не могуць не закрануць цікавыя падзеі свайго рэгіёна, якія выглядаюць значнымі і ў памерах краіны, напрыклад, матэрыял «В Сморгони снимают фильм о Первой мировой войне» (С. Юрэвіч, 18.012019), дзе аўтfр размаўляе з рэжысёрам і сцэнарыстам праекта, даюцца ўражанні ўдзельнікаў праекта, фотаздымкі. Таксама ў рубрыку «Последние новости» трапляюць матэрыялы на гэту тэму.

На электронным рэсурсе Шчучынскай раённай газеты «Дзянніца» ёсць рубрыка «Фестиваль культур», а ў рубрыге «Общество» ўключана

падрубрыка «Культура и духовность», дзе можна знайсці такія матэрыялы, як «Майстрыцы аддзела рамеснай дзейнасці РЦКіНТ падрыхтавалі да свят цудоўныя сувеніры ручной работы» (Г. Каспер, 30.12.2018), «Выхаванцы Шчучынскай дзіцячай школы мастацтваў вярнуліся з перамогай з рэспубліканскага конкурсу» (Г. Каспер, 11.01.2019), «ФОТОРЕПОРТАЖ: Комедия "Пока она умирала" вновь порадовала щучинских зрителей» (Ю. Цімашчук, 11.01.2019) – пра пастаноўку спектакля акцёрамі тэатра-студыі Шчучынскага раённага цэнтра культуры і народнай творчасці, «Іншы Шчучын Таццяны Гуравай» (Г. Каспер, 22.01.2019), «Испытано на себе: рисуем, как Ван Гог, или Художник за один вечер» (Г. Каспер, 27.01.2019) і інш.

У «Астравецкай праўдзе» прадстаўлены раздзел «Культура» ў рубрыцы «Общество» сярод «Духовность», «История», «Медицина», «Образование» и др. Матэрыялы ўяўляюць сабой кароценькія справаздачы з мерапрыемстваў, больш падобныя на фатарэпартажы. Напрыклад, «Мінская "ЛітаСфера" гасцявала ў Астраўцы» (С. Фёдарава, 22.01.2019), «Раённы этап рэспубліканскага агляду-конкурсу дзіцячай творчасці "Прывітанне, свет!" прайшоў у Астраўцы» (Р. Дрэма 20.01.2019), «На калядным балі ў Залессі пабываў хор "Польскае рэха Аўстраўца"» (А. Гануліч,18.01.2019) і інш.

Электронны рэсурс Ваўкавыскай газеты «Наш час» пазіцыянуецца як «Ваўкавыскі навасны партал», таму, лагічна і заканамерна, прадстаўленне культурных падзей будзе падавацца адпаведна.

Зразумела, што, калі размова ідзе пра пэўную тэматыку на старонках друку, справа не толькі ў колькасці публікацый. Гэта не галоўная вартасць, якая вызначае месца культурнай тэматыкі ў выданні, а толькі адна з умоў, каб тэма мела паслядоўнае і пастаяннае гучанне. Не менш важная яшчэ і якасць. Здаецца часам, што змест культурна-масавых мерапрыемств на электронных рэсурсах проста пераказваецца па той схеме, па якой яны раводзяцца. Таму хацелася б болей бачыць аналітычнага падыходу, г. зн. у звязцы з іншымі з'явамі культуры ўбачыць ацэнку журналіста. Зразумела, калі інфармацыя падаецца нейкім блокам, тады праглядвацца сістэма, якая надае інфармацыі пэўную змястоўную важкасць. Журналісты не захапляюцца доўгімі справаздачамі з розных мерапрыемстваў – у апісальна-ілюстрацыйных матэрыялах адсутнічаюць сур'ёзныя думкі і прапановы, таму і час, і сам рэсурс вымагаюць іншага падыходу. Прыемна, калі аўтары не баяцца павялічваць жанравую палітру, смялей уключаюць інтэграваныя падыходы; напрыклад, у тых жа справаздачах выкарыстоўваюць

элементы інтэрв’ю, практыкуюць кароткую гутарку з удзельнікамі, даюць сваю журналісцкую ацэнку. У такім выпадку публікацыя набывае эмацыйна-змястоўную свежасць. Мяркуецца, што тэма культуры сістэмна вызначаецца ўжо на стадыі рэдакцыйнага планавання, дзе важна выдзеляць галоўныя праблемы ў канкрэтным рэгіёне, устанаўліваць дзелавыя кантакты з профільнымі спецыялістамі і гаварыць з імі па розных вострых пытаннях. Пры гэтым зразумела, не забываецца, што суб’ект культуры – чалавек, якога важна ўключыць у сферу духоўнай дзейнасці, далучыць да культурных скарбаў і гістарычнай спадчыны.

**Алена Кунахавец-Плявака**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (г. Мінск, Беларусь)*

## ГАЗЕТА – ЧЫТАЧ: АПТЫМІЗАЦЫЯ МЕДЫЯКАНСЭНСУСУ (на прыкладзе раённых газет Брэстчыны)

Галоўным аб’ектам рэдакцыйнай палітыкі любога сродку масавай інфармацыі з’яўляецца яго мэтавая аўдыторыя. Як паказвае практыка, паспяховая дзейнасць СМІ, іх папулярнасць і аўтарытэт, ступень уплыву на аўдыторыю шмат у чым залежаць ад сувязяў супрацоўнікаў рэдакцый з чытачамі, з тымі, для каго, уласна кажучы, і друкуецца газета, здымаецца тэлеперадача, запісваецца радыёпраграма альбо функцыянуе інтэрнэт-рэсурс.

Цесныя ўзаемаадносіны з чытачом – асаблівасць мясцовага друку. Перш за ўсё гэта абумоўлена статусам газеты рэгіёна: «раёнка» для жыхароў той ці іншай мясцовасці з’яўляецца самым блізкім выданнем. Журналісты раённага друку ведаюць сваіх чытачоў і маюць магчымасць непасрэдна назіраць за рэакцыяй на той ці іншы матэрыял, могуць выявіць прычыны задаволенасці альбо, наадварот, абурэння.

За часы свайго існавання раённыя газеты набылі велізарны вопыт у рэалізацыі дыялогу са сваёй чытацкай аўдыторыяй. Для гэтага традыцыйна выкарыстоўваліся розныя формы арганізацыйна-масавай работы рэдакцый: стварэнне аўтарскага актыву з ліку пазаштатнікаў, правядзенне рэйдаў, круглых сталоў, кампаній, акцый, дыскусій і г. д. Дарэчы, большасць гэтых форм у крыху змененым выглядзе і сёння выкарыстоўваюцца мясцовымі выданнямі для прыцягнення і захавання чытацкай аўдыторыі. З рэдакцыямі газет актыўна супрацоўнічаюць пазаштатныя аўтары, юнкары, хоць і іх кола паступова звужаецца. Практычна не праводзяцца дні адкрытага пісьма, грамадскія прыёмныя, чытацкія канферэнцыі, не так актыўна выкарыстоўваюцца дыскусіі,